*Юлія Кучвальская*

**ЗАБАРОНЫ НА ПРАЦУ Ў СВЯТОЧНЫ ПЕРЫЯД (НА ПРЫКЛАДЗЕ КАЛЯДНЫХ СВЯТАЎ)**

*У артыкуле разглядаюцца асаблівасці забаронаў на працу, іх матывіроўкі ў перыяд калядна-навагодніх святаў у традыцыйнай культуры Заходняга Палесся.*

*Yulia Kuchvalskaya*

**PROHIBITIONS ON WORK IN THE HOLIDAY PERIOD (ON THE EXAMPLE OF CHRISTMAS)**

*The article considers the features of the prohibitions on work and their motivations in the period from Christmas to Epiphany in the traditional culture of the West Polesie.*

Адным з найбольш важных святочных перыядаў у народным календары з'яўляецца калядна-навагодні цыкл. Сярод кампанентаў, якія ўваходзяць у яго структуру, вылучаюцца: рытуальныя дзеянні, песні, вераванні, звычаі, забароны і інш. Гэты святочны двухтыднёвы перыяд успрымаўся насельніцтвам як сакральны час, калі «прафаннае цячэнне будняў перарывалася сакральнымі перыядамі святаў» [3, с. 537]. Як адзначаюць даследчыкі, «як і прастора, Час для рэлігійнага чалавека неаднародны і небесперапынны. Ёсць перыяды Сакральнага Часу. Гэта час святаў (большасць з якіх паўтараецца з пэўнай перыядычнасцю» [6, с. 49]. Калядны абрадавы цыкл пачынаўся і завяршаўся важнейшымі гадавымі святамі: Раством Хрыстовым і Хрышчэннем Гасподнім. Гэта адлюстравана на вербальным узроўні: «Накрывайте столы мілы господару, … / Бо прыдут до тебэ тры празнічкі в госці, … / Бо первы то празнік – Святэ Нарождэнне, … / А другі то празнік – Святого Васілія, … / А трэті то празнік – Святэ Водохрышчэ, / Радуйся, ой, радуйся землё, Сын Божы народівса!» (Целяханы Івацэвіцкага р-на).

У народнай культуры калядна-навагодні перыяд надзяляўся асаблівым статусам. Як адзначаюць даследчыкі, «на ўяўленні аб сакральным грунтуюцца паводзіны веруючага» [1, с. 77]. Для калядных святкаванняў характэрны пэўныя прадпісанні, рэгламентацыі, правілы паводзін і інш. Сюды ўваходзілі прыгатаванне абавязковых страў, афармленне святочнага стала, наведванне культавых месцаў (храма, могілак), святочныя абходы, забароны на работу і г. д. Да калядных святаў рабілі пэўныя загатоўкі (секлі дровы, лучыну, гатавалі стравы і інш.) на ўвесь святочны перыяд, у які ўсе штодзённыя справы спыняліся.

Сакральнае значэнне ў традыцыйнай культуры распаўсюджвалася на ўвесь святочны перыяд, асабліва на першыя дні Раства Хрыстова, Новага года, Вадохрышча, на калядныя вечары, якія называлі святымі. Даследчыкі адзначаюць, што такія народныя святкаванні з'яўляюцца «адлюстраваннем народнага рэлігійнага сінкрэтызму…» [2, с. 510], гэта ёсць злучэнне хрысціянскай і дахрысціянскай традыцый. Як сведчаць навуковыя крыніцы, хрысціянская традыцыя святкаваць дні ў перыяд ад Раства Хрыстова да Вадохрышча ўпершыню засведчана ў першай палове IV ст. [4, с. 179]; у «завершаным выглядзе» традыцыя ўстанавілася ў VI – пачатку VII ст. [7].

Як адзначае В.М. Шарая, забароны – гэта «асобыя правілы, якія рэгламентуюць паводзіны індывідуума і калектыву ў пэўных сітуацыях штодзёнасці, абрадах і гаспадарчай дзейнасці. Забароны, як правіла, маюць двухчасткавую структуру і складаюцца з уласна забароны і яе матывіроўкі» [5, с. 501–502]. Асаблівасцю калядна-навагодняга перыяду з'яўляецца яго напоўненасць шматлікімі забаронамі. Забароны адыгрывалі важную ролю ў калядным абрадавым цыкле. Менавіта праз іх можна выявіць уяўленні людзей, звязаныя са святочным перыядам, стаўленне чалавека да гэтага перыяду часу. Як адзначаюць даследчыкі, «найбольш шматлікімі і строгімі з'яўляюцца забароны, абумоўленыя часам. Гэта ў першую чаргу каляндарныя забароны, найперш забароны на работу ў святы» [5, с. 502], якія характэрны для каляднага абрадавага комплексу. Важным з'яўляецца вызначыць асаблівасці забаронаў на работу ў перыяд ад Раства Хрыстова да Вадохрышча, іх матывіроўкі ў традыцыйнай культуры насельніцтва Заходняга Палесся.

Дадзеныя палявых даследаванняў паказалі, што ў калядна-навагодні перыяд строга забаранялася працаваць. Гэтага правіла абавязкова прытрымліваліся вечарамі, якія ў Заходнім Палессі атрымалі назву *«святы́е вэчора́»*, *«святы́е вечэра́»* (Івацэвіцкі р-н), *«сві́чкэ», «коле́дны вечэра́», «святы́е вэчора́»* (Драгічынскі р-н), *«святы́е ко́леды», «святы́е вэчора́»* (Пінскі р-н).

У духоўнай культуры даследуемага рэгіёна асабліва святочным і найбольш значным быў час ад Раства Хрыстова да Новага года. Згодна з эмпірычнымі дадзенымі, першы святочны тыдзень характарызаваўся строгім прытрымліваннем забаронаў на работу. Па сведчанні інфармантаў, нават не дазвалялася працаваць удзень. Да Шчадрухі (пярэдадзень Новага года) забаранялася стругаць бульбу, секчы дровы, мыць адзенне і г. д.: «Пэ́ршу нэді́лю шчэ тако́ ны робэ́лы, а вжэ на дру́гу хто робы́в, хто ны робы́в, но у вэчоры́ ныхто́ ны робы́в» (Радастава Драгічынскага р-на). Час ад Новага года, згодна з эмпірычнымі дадзенымі, не адрозніваўся такой строгасцю забарон у адносінах да працы. У перыяд ад Новага года да Вадохрышча дазваляліся пэўныя віды работ у буднія дні, як адзначаюць інфарманты, можна было выконваць лёгкую работу. Не забаранялася мыць падлогу, вязаць, часаць лён, драць пер'е, мыць адзенне: «Як Ко́леды, пэ́ршы дэнь Коля́д, другі́ дэнь, ныц нэ мо́жно робі́ты. А там, як Но́вы год про́йдэ, то вжэ мо́жна лён чэса́ты, пе́р'я дра́ты, а до Но́вого го́ду ныц нэ мо́жно робі́ты» (Валішча Пінскага р-на).

У перыяд калядных святкаванняў асабліва строга выконваліся забароны прасці, снаваць, шыць, круціць, секчы, рэзаць і інш. Парушэнне дадзеных забаронаў лічылася вялікім грахом: «О, не! Да́жэ ныхто́ і в



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ру́кы тако́го ны брав. ... Две ніде́лі ны бра́лы: ны пра́лы, ны тка́лы» (Крамно Драгічынскага р-на), «Гріх, ны мо́жна. Бу́дэ пло́хо. Трэ́ба сполня́ты, так йек трэ́ба» (Радастава Драгічынскага р-на), «Пра́зновалы. Ве́рылы в Бо́га, зна́чыть нельзя́. ... Выно́сять з ха́ты ты́е потосі́ і две ніде́лі пра́знують» (Субаты Драгічынскага р-на).

У адпаведнасці з народнымі ўяўленнямі, невыкананне гэтых правілаў магло пагражаць жыццю чалавека. У выпадку парушэння забароны на свет маглі нарадзіцца пакалечаныя дзеці і такі ж прыплод у скаціны: «Ныльзя́, то шчы пра́знікі. Хто так во робэ́в, то не́ко того́ і поколі́чыло ді́ты, хто прев там. Ны мо́жна було́» (Сварынь Драгічынскага р-на), «Нэ мо́жна, потому́ шчо, як хо́дыть скоты́на те́льная чы свіння́ поро́сна, чы овэ́чка то́жэ, як хо́дыть дак мо́жэ ёй шо зробы́тысь» (Хваросна Пінскага р-на).

Найбольшая група такіх забаронаў матывавалася засцярогай хатняй гаспадаркі ад розных калецтваў. У святочны перыяд нельга было шыць, бо жывёліна магла нарадзіцца сляпой або з зашытым ротам: «А скоті́ну держа́лі, шоб як зашыва́еш, то шоб теля́тка ні слепы́е роді́ліса. ... Длі́ліс Коля́ды две неде́лі – святы́е вэчора́ булі́» (Вулька-Целяханская Івацэвіцкага р-на), «Шыты потому́ нэльзя́, шо ка́жуть, позашыва́еш хозя́йство якэ́ дэржы́ш» (Хваросна Пінскага р-на). Таксама забаранялася шыць, бо баяліся, каб карова не пачала кульгаць: «Ны шы́лы, шоб коро́ва ны кульга́ла» (Сварынь Драгічынскага р-на).

У калядна-навагодні перыяд не дазвалялася малоць, круціць, загінаць і г. д., інакш хатняя жывёла магла нарадзіцца з пакалечанымі канечнасцямі: «І моло́ты ны мо́жна було́, бо йек коро́ва тэле́тко ро́дыть чы там свіння́ поросе́т навэдэ́, то но́гі закру́чэны булы́. Моя́ ма́ма каза́ла, шо і в ма́мы так було́. ... Бог нака́звав, шо ны мо́жна було́» (Сварынь Драгічынскага р-на), «...коб ны круты́в, коб ны загына́в нычо́го, бо дае́ на скоты́ну. Шчы так йек хо́дыть берэ́мена, то мо́жэ і калі́чка вроды́тыся, то на сві́чкі мы ныц ны робе́лы. У нас на сві́чкі всё загото́вленэ було́: і дро́ва, і лучы́на. Ныхто́ ны руба́в дві нэді́лы» (Сварынь Драгічынскага р-на).

Забароны на шыццё, прадзенне звязаныя і з іншымі матывіроўкамі: «До Шчо́дру́хы ны шы́лы, до Но́вого го́да, бо каза́лы шо як бу́дыш шы́ты, то бу́дэ в мя́совэ чырвья́кы» (Ліпнікі Драгічынскага р-на), «А колі́ потэ́сі то ж пра́лі, да выкіда́ем, коб іх і нэ ба́чыты. Вэрэтэно́, як дэ поба́чыш в Коледа́х, то по́йдэш в лес да поба́чыш змею́» (Валішча Пінскага р-на).

Па сведчанні інфармантаў, шыць у святочны перыяд дазвалялася ў пэўныя дні: напярэдадні Раства Хрыстова, Новага года і Вадохрышча (Целяханы Івацэвіцкага р-на) або толькі ў адзін з трох пярэдадняў: «...А ты́лько оно́ на Шчо́дрыка, пырыд Но́вым го́дом рукавы́цы ла́пылы, коб тыля́та чы овэ́чкы, коб булы́ лы́сынькійі» (Фядоры Столінскага р-на).

Згодна з народнымі ўяўленнямі, забароны на працу ў калядна-навагодні перыяд, як ужо адзначалася, звязаны з асноўнымі святамі хрысціянскага календара, што прыпадаюць на дадзены перыяд: Раство Хрыстова і Вадохрышча, і з адпаведнымі падзеямі, характэрнымі для гэтых святаў: «Вэчоры́ святы́йі, бо Ісу́с Хрысто́с роды́вся» (Ліпнікі Драгічынскага р-на), «Э́то вечэ́ра захо́ділі. Потому́ шо говоры́лі Хрысто́с роді́лся но́ччу. ...Роді́лся седьмо́го, а крэсті́лі девятна́ццатого» (Завялёўе Драгічынскага р-на).

Такім чынам, у адпаведнасці з фальклорна-этнаграфічнымі матэрыяламі, атрыманымі ў выніку праведзеных палявых даследаванняў у Заходнім Палессі, мэтай выканання забаронаў на працу ў святочны перыяд з’яўляецца прадухіленне падзей, якія пагражаюць дабрабыту людзей, стану здароўя свойскай жывёлы і інш.

**Спіс літаратуры:**


1. Гараджа, В. И. Социология религии : учеб. пособие для студ. и асп. гуманитар. спец. / В. И. Гараджа. – М. : Инфра-М, 2010. – 304 с.
2. Гурскі, А. І. Святыя вечары / А. І. Гурскі // Беларускі фальклор : энцыкл. / рэдкал. : Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭН, 2005. – С. 51 – 511.
3. Левкиевская, Е. Е. Сакральный / Е. Е. Левкиевская // Славянские древности : этнолингвист. словарь : в 5 т. / под общ. ред. Н. И. Толстого. – М. : Междунар. отношения, 2009. – Т. 4 : П (Переправа через воду) – С (Сито). – С. 534 – 538.
4. Скабалланович М. Христианские праздники : Рождество Христово / М. Скабалланович. – Киев : Тип. Акц. О-ва «Пётр Барский в Киеве», 1916. – 196 с.
5. Шарая, В. М. Забароны / В. М. Шарая // Беларускі фальклор : энцыкл. / рэдкал. : Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭН, 2005. – С. 501 – 502.
6. Элиаде, М. Священное и мирское / М. Элиаде ; пер. с франц., предисл. и ком. Н. К. Гарбовского. – М. : Изд-во Моск. ун-та, 1994. – 144 с.
7. Дионисий (Шленов). Время празднования Рождества и Крещения согласно древним свидетельствам и памятникам полемической письменности середины XI века / Дионисий (Шленов) // Богословский вестник [Электронный ресурс]. – 2009. – Режим доступа : http://www.bogoslov.ru/text/373000.html#_ftnref94. – Дата доступа : 07.02.2016.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ